Дзяржаўная ўстанова культуры
”Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна“
Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Кніжкіна часіна

З вопыту работы дзіцячага літаратурнага клуба ”Чытайка“ бібліятэкі-філіяла № 7



Гродна, 2017

Дзяржаўная ўстанова культуры
“Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна”

Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Кніжкіна часіна

**З вопыту работы дзіцячага літаратурнага клуба “Чытайка” бібліятэкі-філіяла № 7**

Гродна, 2017

Кніжкіна часіна: з вопыту работы дзіцячага літаратурнага клуба “Чытайка” бібліятэкі-філіяла № 7 / ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна”, Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка, аддзел бібліятэчнага маркетынгу; склад. А.С. Рубель; рэд. Н.Ю. Наземцава. – Гродна, 2017– 28 с.

Выданне змяшчае інфармацыю пра лепшы вопыт работы літаратурнага клуба “Чытайка” бібліятэкі-філіяла № 7 ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна”.

Адрасавана бібліятэчным спецыялістам.

# Кніжкіна часіна

Пра сусветнавядомыя кнігі і іх знакамітых аўтараў, пра гісторыю літаратуры, пра тое, як становяцца пісьменнікамі і адкуль да нас прыйшла кніга – усё гэта ведаюць удзельнікі дзіцячага літаратурнага клуба “Чытайка”, што дзейнічае пры бібліятэцы-філіяле № 7 Дзяржаўнай установы культуры “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна”.

**Дзіцячы літаратурны клуб “Чытайка”** быў створаны ў 2007 годзе. Яго першымі ўдзельнікамі сталі вучні 2 “Б” класа Сярэдняй школы № 22 г. Гродна, а кіраўніком – Жураўская Іаланта Марыёнаўна, на той час, загадчык бібліятэкі-філіяла № 7 ЦБС г. Гродна



**Першыя ўдзельнікі клуба “Чытайка”**

І ўжо ў сакавіку пяць лепшых чытачоў-членаў клуба “Чытайка” былі запрошаны ў гарадскі Дом культуры на свята дзіцячай кнігі. Яны аказаліся самымі маленькімі сярод удзельнікаў, але гэта не перашкодзіла ім камфортна адчуваць сябе на сцэне і выступаць перад шматлікай аўдыторыяй – дзеці выразна дэкламавалі вершы знакамітага беларускага пісьменніка Янкі Купалы.

Бібліятэкары бралі актыўны ўдзел у арганізацыі вольнага часу і чытання дзяцей. Для таго, каб прыцягнуць хлопчыкаў і дзяўчынак да кнігі, здзівіць іх, зарадзіць бадзёрым і вясёлым настроем у клубе ладзілі вялікую колькасць пазнавальных і забаўляльных мерапрыемстваў.

Адным з накірункаў работы дзіцячага літаратурнага клуба “Чытайка” было знаёмства з выданнямі пра гістарычнае мінулае

роднага горада. У маі 2008 года цікава прайшла гадзіна гісторыі “Давай ганарыцца, што мы – гродзенцы!”, якая была прысвечана 880-годдзю з часу заснавання г. Гродна. Да мерапрыемства супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі самаробны часопіс, які ў маляўнічых ілюстрацыях змяшчаў гістарычныя перыяды развіцця горада. Дзеці ўважліва слухалі бібліятэкараў і стараліся запомніць асноўныя даты і прозвішчы знакамітых гістарычных асоб. Падчас мерапрыемства падрабязна расказалі пра славуты помнік гродзенскай архітэктуры XII стагоддзя – Барысаглебскую царкву, якая і цяпер з’яўляецца гонарам гродзенцаў. Напрыканцы пасяджэння дзеці малявалі паштоўкі з відамі гістарычнага Гродна, што вельмі спадабалася ім – кожны стараўся ўкласці ў малюнак ўсю сваю фантазію.

Краязнаўчай тэме была прысвечана экскурсія ў мінулае г. Гродна ў 2009 годзе “Я па горадзе іду”. Удзельнікі мерапрыемства даведаліся як узнікла пасяленне, на месцы якога з’явіўся Гродна, пра будынкі, якія захаваліся да нашых дзён і пра заняткі жыхароў старажытнага горада. Таксама для дзяцей ладзілі цыкл мерапрыемстваў “Святы беларусаў”, падчас якіх знаёмілі ўдзельнікаў клуба з новымі кнігамі і часопісамі пра народныя і рэлігійныя беларускія святы, праводзілі майстар-класы па вырабе святочных сувеніраў.

Значную ўвагу кіраўнік клуба ўдзяляла папулярызацыі твораў беларускіх аўтараў сярод падрастаючага пакалення. З гэтай мэтай у бібліятэцы былі праведзены: гульня-віктарына па беларускіх народных казках “Чароўны куфэрак”, пазнавальная гадзіна да Дня беларускага пісьменства “Які ж гэта цуд – слова, мова твая!” і г.д.

Дзецям вельмі падабаліся літаратурныя гульні і віктарыны, асабліва калі трэба было ўспомніць прачытаныя творы, назваць як мага больш літаратурных герояў, пералічыць казачныя рэчы, назвы якіх пачынаюцца на адну літару і да т.п.

У 2007 годзе на адным з мерапрыемстваў удзельнікам клуба было прапанавана адправіцца ў далёкае казачнае падарожжа “Добрыя казкі – сябры назаўжды”. У дарогу сабралі клункі, куды ўвайшлі самыя неабходныя рэчы: абрус-самабор, чароўнае люстэрка, сасуд з жывой вадой і адправіліся ў краіну Казак. Шмат перашкод давялося пераадолець дзецям перш, чым яны атрымалі “чароўны” ключ адваротаў казачнай краіны: прыйшлося адказаць на каверзныя пытанні Бабы-Ягі пра нячысцікаў, перайсці топкае балота, дзе жыве Кікімара, адгадаць галасы літаратурных герояў, якія гучалі ў дрымучым лесе і інш. Усе добра папрацавалі, а лепшыя атрымалі ўзнагароды.

Удзельнікам клуба “Чытайка” надоўга запомніўся “Парад літаратурных герояў” – у 2008 годзе на сустрэчу з дзецьмі прыйшлі казачныя персанажы: Нязнайка, Чыпаліна, Чырвоная Шапачка і Мальвіна. Хлопчыкі і дзяўчынкі паспяхова пазналі ўсіх літаратурных герояў і павіталі іх. Чырвоная Шапачка падрыхтавала цікавыя заданні: дзецям давялося адгадаць назвы твораў па ўрыўках з казак, пазнаць казачных персанажаў па іх апісанні, а з дапамогай жэстаў патлумачыць хто гэты літаратурны герой. Самыя кемлівыя атрымалі чароўныя падарункі.

Праз прызму літаратурных твораў бібліятэкары садзейнічалі маральна-этычнаму выхаванню падрастаючага пакалення. На пасяджэннях клуба ўзнімаліся пытанні ўзаемаадносін з сябрамі і бацькамі. Дзеці вучылі “чароўныя” словы і правілы паводзін, якія спрыялі ўзаемаразуменню паміж людзьмі, вучыліся сябраваць і дапамагаць адзін аднаму.

Да літаратурнага падарожжа па кнізе Віктара Драгунскага “Дзяніскіны аповеды” ўдзельнікі клуба рыхтаваліся загадзя – пазнаёміліся з матэрыяламі пра жыццё і творчую дзейнасць пісьменніка, прачыталі яго творы. Падчас мерапрыемства ў бібліятэцы пераказвалі найбольш цікавыя ўрыўкі і тлумачылі якія якасці характару галоўнага героя паказаны ў апавяданні, успаміналі

падобныя выпадкі з жыцця свайго класа. Завяршылася падарожжа разгадваннем крыжаванкі па творах В. Драгунскага.

Кіраўнік клуба імкнулася выхаваць у дзяцей любоў да прыроды, да ўсяго жывога ў акаляючым асяроддзі з дапамогай твораў Міхаіла Прышвіна. Падчас пасяджэння "Пра прыроду – з любоўю, павагай, пяшчотай" у 2008 годзе хлопчыкі і дзяўчынкі пераказвалі прачытаныя творы пісьменніка, успаміналі свае назіранні за жывой прыродай, за хатнімі гадаванцамі. Пазней для ўдзельнікаў клуба былі арганізаваны: экалагічны ўрок "Дзякуем птушкам, рыбам, звярам", экалагічнае падарожжа "Невядомае пра вядомае" і інфармацыйная гадзіна "Птушыныя пытанні".

Значная ўвага пры арганізацыі дзейнасці літаратурнага клуба "Чытайка" ўдзялялася і сямейнаму выхаванню. У маі 2007 года ў бібліятэцы адбылося "Вялікае сямейнае свята", прымеркаванае да Дня сям'і. Таксама гэта мерапрыемства падводзіла вынікі работы клуба за год. На свята ў бібліятэку дзеці прыйшлі разам з бацькамі. Спачатку бібліятэкары зачыталі выказванні ўдзельнікаў клуба пра сваю сям'ю і пра тое, кім яны мараць стаць у будучыні. Пасля хлопчыкі і дзяўчынкі з задавальненнем малявалі партрэты мамы і таты. Падчас мерапрыемства бацькі адказвалі на пытанні гумарыстычнай віктарыны па дамаводстве, а дзеці – на пытанні літаратурнай віктарыны па казках, якія чыталі дома і ў бібліятэцы на працягу года. Загадкі на кемлівасць, шматлікія конкурсы, салодкія пачастункі і прызы – свята прайшло весела і цікава!

На пасяджэннях у клубе дзеці часта малявалі сваіх любімых літаратурных герояў, ілюстрацыі да прачытаных твораў, сумесна размалёўвалі доктара Айбаліта і інш. Кіраўнік клуба лічыла, што ў малюнках найбольш ярка праяўляецца асоба дзіцяці, яго ўспрыманне свету, а заняткі маляваннем спрыяюць развіццю ўяўлення ў дзяцей, лепшаму ўспрыманню інфармацыі і яе запамінанню.

У 2017 годзе дзіцячы літаратурны клуб “Чытайка” святкуе свой 10-гадовы юбілей. На сённяшні дзень у аб’яднанні змяніліся чатыры пакаленні “чытаек”, але ўсе яны былі і застаюцца сапраўднымі аматарамі літаратуры і пастаяннымі чытачамі бібліятэкі.

***

З 2009 года арганізацыяй дзейнасці дзіцячага літаратурнага клуба **“Чытайка”** займаецца бібліятэкар Змітровіч Кацярына Дзмітрыеўна.

“Усё пачынаецца з дзяцінства! Усе дзеці разумныя і таленавітыя!” – так лічыць Кацярына Дзмітрыеўна пры арганізацыі мерапрыемстваў у клубе.

Работа аб’яднання накіравана на інтэлектуальнае, культурнае і духоўнае развіццё маленькіх чытачоў, прыцягненне іх да чытання і кнігі.

Сярод мерапрыемстваў клуба пераважаюць гучныя чытанні і абмеркаванне твораў, літаратурныя віктарыны і конкурсы, урокі літаратурнага чытання, гадзіны паэзіі, гульнёвыя праграмы і інш.

Звычайна мерапрыемствы ўключаюць некалькі форм масавай работы: кніжную выставу, агляд літаратуры, конкурсную праграму, тэатралізаванае прадстаўленне і г.д. Для іх арганізацыі і правядзення актыўна выкарыстоўваюцца сучасныя мультымедыйныя сродкі: электронныя прэзентацыі, відэафільмы.

Падчас пасяджэнняў кіраўнік клуба стараецца прывучыць дзяцей любіць кнігі, беражліва адносіцца да іх, вучыць выбраць патрэбнае выданне, стаць удумлівым чытачом і на ўсё жыццё запомніць свае любімыя дзіцячыя кніжкі.

**“Чытай, думай, суперажывай!”** – пад такім дэвізам дзеці сустракаюцца на мерапрыемствах у клубе. А галоўныя ўмовы для ўдзельнікаў аб’яднання – **не сумаваць, не злавацца, не зайздросціць, не крыўдзіць і не крыўдзіцца**.

***

Кіраўнік літаратурнага клуба “Чытайка”, Кацярына Дзмітрыеўна Змітровіч, пры арганізацыі мерапрыемстваў імкнецца раскрыць дзецям багацце сусветнай літаратуры, пазнаёміць іх з жыццём і творчай дзейнасцю дзіцячых аўтараў.

Многія з пасяджэнняў аб’яднання былі прысвечаны **юбілеям вядомых пісьменнікаў**. У клубе адбыліся святочныя мерапрыемствы да дня нараджэння А. Пушкіна, В. Асеевай, К. Чукоўскага, М. Прышвіна, Р. Остэра, С. Маршака, С. Міхалкова, В. Драгунскага, А. Мілна, К. Калодзі, Р. Распэ і інш.

У пачатку 2015 года “чытайкі” падчас літаратурнай гадзіны “Як на Такмаковай імяніны” адзначылі дзень нараджэння адной з самых добрых дзіцячых пісьменніц Ірыны Такмаковой. На прыкладзе яе вершаў кіраўнік клуба вучала дзяцей спазнаваць навакольны свет, а па аповесці “Шчаслівa, Івушкін!” – пастаралася зрабіць іх сябрамі прыроды.

У сакавіку 2015 года члены клуба “Чытайка” адсвяткавалі 200-годдзе Пятра Яршова, аўтара выдатнай казкі “Канёк-Гарбунок”. Дзеці даведаліся аб жыцці пісьменніка, сталі ўдзельнікамі літаратурнай віктарыны і конкурсу на лепшага “перакладчыка" з мовы часоў П. Яршова на сучасную. Лепшы перакладчык і пераможца ў віктарыне атрымалі прызы.

А ў лістападзе ўрачыста і весела адзначылі 105-годдзе з дня нараджэння Ліі Гераскінай, аўтара адной з самых вядомых дзіцячых кніг “У краіне нявывучаных урокаў”. Хлопчыкі і дзяўчынкі чыталі твор дома. Ім вельмі спадабаліся пацешныя вершы, незвычайныя прыгоды хлопчыка Віці Перастукіна і яго ката Кузі. Дзеці даведаліся пра памылкі, якія Віктар паспеў зрабіць у школе, навучыліся рашаць задачы, успомнілі правілы граматыкі і



**Юбілей Л. Гераскінай**

зразумелі, як важна і цікава атрымліваць веды. На пасяджэнні ў клубе яны пазнаёміліся з біяграфіяй пісьменніцы, а падчас віктарыны вылучыліся лепшыя знаўцы твораў Л. Гераскінай. У гульні “Сюрпрыз” успомнілі герояў кнігі “У краіне нявывучаных урокаў” – ката Кузю і Белага мядзведзя.

У 2016 годзе ў клубе святкавалі 115-ты дзень нараджэння вядомага мастака-аніматара і знакамітага аўтара апавяданняў аб жывёлах Яўгена Чарушына. Падчас літаратурнай гадзіны “Рабятам аб звярках” дзеці паглядзелі відэаматэрыял аб жыцці і творчасці знакамітага пісьменніка, паслухалі апавяданне “Ваўчаня”. Потым яны сталі ўдзельнікамі віктарыны пра жывёл, пераможца якой атрымаў на памяць пра сустрэчу мяккую цацку.

У 2012 годзе адно з пасяджэнняў клуба было прысвечана гумарыстычным творам. На мерапрыемстве дзеці пазнаёміліся з творчасцю Карнея Чукоўскага і Самуіла Маршака. Таксама даведаліся пра значэнне слова “гумар”, вызначылі, што робіць смешнымі герояў іх вершаў і казак. Пасля ім была прапанавана літаратурная віктарына з гумарыстычнымі пытаннямі.



**“Рабятам аб звярках”: літаратурная гадзіна**

Шэраг мерапрыемстваў “Свет герояў Мікалая Носава” у клубе быў прысвечаны творчасці самага любімага дзіцячага пісьменніка М. Носава. У красавіку 2015 года тры каманды спаборнічалі на лепшага знаўца твораў пісьменніка. Дзяцей чакалі віктарына па творчасці знакамітага аўтара, конкурсы на лепшае выкананне песні “У траве сядзеў конік”, на лепшае чатырохрадкоўе па зададзенай рыфме і гульня “Шыфравальшчык”.

Адметная рыса дзейнасці літаратурнага клуба “Чытайка” – **святкаванне “кніжных юбілеяў”**. У 2012 годзе літаратурная гадзіна “55 гадоў з “Вясёлкай” была прысвечана юбілею першага беларускамоўнага дзіцячага часопіса (кіраўнік клуба “Чытайка” прапануе адзначыць у бягучым годзе 60-годдзе “Вясёлкі” – сцэнарый мерапрыемства глядзіце ў Дадатку № 1). Знаёмства з гісторыяй выдання пачалося са знаёмства з творчасцю яго стваральніка – Васіля Віткі і першых аўтараў – Янкі Купалы і Якуба Коласа. Потым дзяцей запрасілі ў падарожжа па старонках часопіса “Ад рубрыкі да рубрыкі”, дзе яны пазнаёміліся з пісьменнікамі і паэтамі, чые творы змяшчаліся ў выданні. Далей было гучнае чытанне вершаў на тэму "Люблю Беларусь" і гульня “Хвілінкі-весялінкі”.

У 2015 годзе літаратурная гадзіна ў клубе была прысвечана 185-годдзю з часу напісання твора Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна “Казка пра папа і яго работніка Балду”. Дзеці пазнаёміліся з творчасцю пісьменніка, героямі яго твораў. Аб тым, хто прывіў А.С. Пушкіну любоў да рускай мовы, да фальклору і якое значэнне ў станаўленні жанру рускай літаратурнай казкі мела яго творчасць расказалала на мерапрыемстве К.Д. Змітровіч. Да ўвагі дзяцей быў прапанаваны музычны мультфільм па казцы і займальная віктарына, якая выявіла самага ўважлівага слухача мерапрыемства.



**Літаратурная гадзіна да 185-годдзя “Казкі пра папа і яго работніка Балду” А.С. Пушкіна**

Яшчэ адно пасяджэнне, якое адбылося ў 2016 годзе, мела назву “Такое рознае дзяцінства” і было прысвечана 155-годдзю з часу напісання паэмы Мікалая Някрасава “Сялянскія дзеці”.

Удзельнікі мерапрыемства даведаліся аб біяграфіі паэта, паслухалі ўрыўкі з паэмы, з дапамогай бібліятэкара зрабілі аналіз тэксту. Потым дзецям прапанавалі пачытаць вершы сучасных аўтараў пра дзяцінства. Творы выклікалі ажыўленне і актыўнае абмеркаванне. Юныя чытачы гаварылі пра тое, як змянілася грамадства і жыццё дзяцей у сучасны час.

У маі 2016 года ў літаратурным клубе "Чытайка" адзначылі 65-годдзе з часу выхаду кнігі Джані Радары "Прыгоды Чыпаліны" на рускай мове. Дзеці паглядзелі прэзентацыю па творчасці аўтара, адказалі на пытанні вясёлай віктарыны і разгадалі крыжаванку. Удзельнікі пасяджэння атрымалі ў падарунак кніжныя закладкі, а пераможцу ўручылі "партрэт" Чыпаліны.

Адным з напрамкаў работы клуба з'яўляецца **патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення** з дапамогай літаратурных твораў.

У пачатку 2010 года ў бібліятэцы арганізавалі незвычайнае мерапрыемтсва – літаратурную сустрэчу з вядомай "Сказкой про военную тайну, Мальчиша-Кибальчиша и его твердое слово" Аркадзя Гайдара – адным з лепшых твораў патрыятычнага характару для дзяцей. Хлопчыкі і дзяўчынкі прачыталі "Сказку" дома і падчас пасяджэння хутка вызначылі, што ў ёй казачнае, а што сапраўднае, што такое здрада і народная памяць. Пасля абмеркавання твора дзеці паказалі як яны рыхтуюцца стаць абаронцамі Айчыны – дружна ўдзельнічалі ў спаборніцтвах "Моцным, смелым вырастай!".

У маі 2010 года да 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне адбыўся ўрок памяці па творчасці Сяргея Аляксеева "Сто апавяданняў аб вайне". Удзельнікі мерапрыемства чыталі простыя і мудрыя творы аўтара, героі якіх валодаюць кемлівасцю, фізічнай сілай, вернасцю свайму слову. Галоўнае, што дзеці спазналі, прачытаўшы апавяданні – неабходнасць захоўваць вернасць Радзіме.

Конкурс на званне “Багатыр – 2011” сярод “чытаек” быў прымеркаваны да Дня абаронцаў Айчыны. Дзеці ўспомнілі быліны і казкі, з якіх яны ўпершыню даведаліся аб абаронцах Радзімы. Бібліятэкары пазнаёмілі іх з творамі аб Аляксандры Неўскім і Давыдзе Гарадзенскім. Пасля усе разам успомнілі беларускіх воінаў-памежнікаў і памятныя мясціны Гродна, звязаныя з яго абаронцамі.

Надоўга запомнілася дзецям мерапрыемства, прысвечанае 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Гасцямі сустрэчы “Непрыдуманыя героі” ў 2015 годзе сталі гродзенскія пісьменнікі Віктар Кудлачоў і Ірына Фамянкова. Яны прадставілі кнігу В. Кудлачова “Вайна вачыма дзіцяці”, а вершы з гэтага выдання прагучалі ў выкананні членаў клуба “Чытайка”. Мэта мерапрыемства – напомніць дзецям пра мужнасць і гераізм людзей, якія аддалі сваё жыццё за Перамогу.



**Сустрэча з В. Кудлачовым і І. Фамянковай**

Таксама з мэтай патрыятычнага выхавання дзяцей былі праведзены ўрокі памяці “Дзяцінства, абпаленае вайной”, “Ля святога агню”, урок гісторыі “Дзеці Брэсцкай крэпасці” і інш.

Значную ўвагу ўдзяляе кіраўнік клуба **духоўна-маральнаму выхаванню** дзяцей. Кацярына Дзмітрыеўна прыкладае намаганні, каб праз кнігу і чытанне навучыць дзяцей суперажываць і дапамагаць адзін аднаму, выхаваць у іх міласэрнасць і добразычлівасць, чуласць і спачуванне, цярплівыя адносіны да акружаючых.

На ўроку дабрыні “Не забывай пагладзіць кацяня” ў 2012 годзе гаворка вялася пра адносіны людзей да жывёльнага свету. Разам з бібліятэкарамі дзеці ўспомнілі “прыказкі пра дабрыню і прынялі

ўдзел у гульні “Добрыя словы”. Закончыліся заняткі праглядам мультфільма “Кветачка-сяміпялёстак”. Бібілтэкары ўпэўнены ў тым, што, дзякуючы гэтаму мерапрыемству, ім ўдалося “пасеяць зерне дабрыні ў дзіцячых душах”.

Таксама правілам добрых паводзін вучыліся на прыкладах апавяданняў Валянціны Асеевай. Кацярына Дзмітрыеўна Змітровіч гаварыла з дзецьмі пра школьны этыкет, а дзеці ўспаміналі добрыя і не вельмі выпадкі са свайго школьнага жыцця, выказвалі асабістыя думкі пра тое, як трэба сябе паводзіць у той ці іншай сітуацыі. Разам з бібліятэкарам яны абмяркоўвалі складаныя моманты ў жыцці, цяжкасці зносін з сябрамі і бацькамі і імкнуліся дапамагчы адзін аднаму парадамі. “Чытайкі” дамовіліся ў бібліятэцы прытрымлівацца “бібліятэчнага этыкету”.

У 2011 годзе з мэтай прыцягнення дзяцей **да чытання твораў на беларускай мове** К.Д. Змітровіч арганізавала для іх вусны часопіс “Нібы маці, берагчы працаўніцу нашу – мову”, які складаўся з 4-х старонак: “Мы – беларусы”, “Наш край”, “Мова любай нам зямлі”, “Старонка бібліяграфіі”. Пасля знаёмства з бібліяграфічнай старонкай, прысвечанай творчасці Максіма Багдановіча, дзеці інсцэніравалі ўрывак з казкі пісьменніка “Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык”.

Увогуле удзельнікі клуба любяць браць удзел у касцюміраваных інсцэніроўках, тэатралізаваных прадстаўленнях, якія значна ажыўляюць і ўпрыгожваюць мерапрыемствы.

На пасяджэннях клуба дзеці пачулі шмат павучальных і цікавых гісторый з твораў сучасных беларускіх пісьменнікаў, сабраных у серыю “Казкі XXI стагоддзя”.

Кіраўнік клуба прыкладае намаганні **для развіцця інтэлектуальных і творчых здольнасцяў дзяцей**. На адным з пасяджэнняў клуба ў 2011 годзе для іх быў арганізаваны “аўкцыён ведаў” па старонках любімых кніг. Адказваючы на пытанні віктарыны, дзеці праверылі свае веды па літаратуры, геаграфіі,

логіцы. А ў 2015 годзе яны паспрабавалі сябе ў ролі сапраўдных пісьменнікаў. Для іх быў арганізаваны конкурс “Аматары славеснасці” на лепшае апавяданне. Пераможцы, як заўсёды, атрымалі памятныя падарункі.

У апошні час вялікай папулярнасцю карыстаецца дзейнасць творчай майстэрні для дзяцей. У бібліятэцы створана прастора “зрабі сам”, мэта якой – развіццё крэатыўнага пачатку і творчага мыслення дзяцей. Падчас заняткаў удзельнікі клуба маюць магчымасць разам з бібліятэкарамі ляпіць з пластыліну, маляваць любімых літаратурных герояў, займацца арыгамі і г.д.



**Заняткі ў творчай майстэрні**

Часта мерапрыемствы ў клубе “Чытайка” былі прысвечаны **матулям**. У 2010 годзе напярэдадні Дня жанчын дзеці адправіліся ў літаратурнае падарожжа па зборніку вершаў дзіцячай пісьменніцы Алены Благінінай “Вось якая мама”. Хлопчыкі і дзяўчынкі дома вывучылі напамяць вершы і з задавальненнем дэкламавалі іх падчас пасяджэння. Потым усе разам адказвалі на пытанні да верша “Елка”, адгадвалі загадкі А. Благінінай. У 2013 годзе быў арганізаваны святочны конкурс на лепшага чытача вершаў, прысвечаных Міжнароднаму дню жанчын. Кіраўнік клуба пазнаёміла дзяцей з выставай кніг “Свята мамы – самае-самае”.

Пасяджэнні ў клубе **напярэдадні летніх канікулаў** праходзілі ў форме выстаў-прэзентацый выданняў “Што мне летам прачытаць?”. Бібліяграфічныя агляды літаратуры заўсёды суправаджаліся вершамі, загадкамі і цікавымі заданнямі. Кацярына Дзмітрыеўна расказвала як правільна весці дзённік чытання і як

ператварыць яго ў маляўнічы альбом. А ў верасні-кастрычніку "чытайкі" збіраліся дзеля таго, каб расказаць пра прачытаныя летам кнігі, пазнаёміць сяброў з новымі літаратурнымі героямі.

На працягу 10 гадоў традыцыйна для ўдзельнікаў літаратурнага клуба "Чытайка" праводзіліся **святочныя навагоднія мерапрыемствы**: пазнавальна-забаўляльная праграма "Як выглядаюць Дзеды Марозы розных краін", гульнёвая праграма "Навагодні серпантын", навагодні марафон "Аднойчы ў Снежным каралеўстве", святы "Святло Каляднай зоркі", "Чароўны пах елкі", гадзіна паэзіі "Рускія паэты пра зіму..." і інш.

У 2016 годзе ў клубе "Чытайка" з'явіліся новыя ўдзельнікі – вучні 1 "А" класа ДУА "Сярэдняя школа № 7". 15 верасня, у Дзень бібліятэк, для іх была арганізавана экскурсія па бібліятэцы-філіяле № 7. Хлопчыкі і дзяўчынкі пазнаёміліся з выставамі чытальнай залы і абанемента, пагарталі маляўнічыя часопісы, пагулялі ў літаратурныя гульні і ўзялі дамоў выданні, якія ім найбольш спадабаліся. Бібліятэкары запрасілі дзяцей наведаць установу разам з мамамі і татамі, а юныя чытачы напісалі пажаданні бібліятэцы на каляровых далонях і самі наклеілі іх на плакат.



**"Чытайка" – гэта МЫ!**

У наступны раз "чытайкі" пазнаёміліся з жыццём і творчай дзейнасцю Карнея Чукоўскага і сталі сапраўднымі акцёрамі тэатралізаванага прадстаўлення па



**"Муха-Цакатуха": тэатралізаванае прадстаўленне**

яго казцы “Муха-Цакатуха”. Таксама Кацярына Дзмітрыеўна расказала дзецям пра цікавыя і займальныя казкі К. Чукоўскага, героямі якіх з’яўляюцца звяры і людзі, іх вартасці і заганы. Зразумела, усе дзеці з задавальненнем узялі кнігі аўтара дадому, каб пачытаць у вольны час.

Апошняе пасяджэнне клуба “Новы год – час чараўніцтва” ў 2016 годзе было святочным і вясёлым. Хлопчыкі і дзяўчынкі мелі магчымасць папрацаваць у “творчай майстэрні” – яны рабілі анёлаў з паперы. Таксама дзеці адкрылі для сябе сэнс свята Калядаў, гулялі, рыхтаваліся да сустрэчы Дзеда Мароза і, нават, бралі ўдзел у навагоднім спектаклі.



**“Новы год – час чараўніцтва”: творчая майстэрня**

На першым пасяджэнні ў 2017 годзе ўдзельнікі літаратурнага клуба “Чытайка” пазнаёміліся з павучальнымі народнымі казкамі, вершамі Агніі Барто, апавяданнямі Яўгена Пермяка, якія дапамаглі ім зразумець сэнс прымаўкі: як гукнеш, так і адгукнецца. У гульнёвай форме дзеці вучыліся будаваць адносіны ў класе з сябрамі і дома з бацькамі, паважліва адносіцца да людзей, асабліва да старэйшага пакалення.

Напярэдадні вясновых канікулаў “чытайкі” гаварылі пра тых, хто з казачных герояў парушыў наказ, які ім давала мама, і што з гэтага атрымалася. Дзеці ўспомнілі казкі розных народаў свету, абмеркавалі канкрэтныя казачныя сітуацыі, у якія трапілі непаслухмяныя і даверлівыя героі твораў. А потым яны бралі ўдзел у тэатралізаваным



**“Воўк і сямёра казлянят”: тэатралізаванае прадстаўленне**

прадстаўленні “Воўк і сямёра казлянят”. Гэтая сустрэча навучыла дзяцей як не стаць ахвярай нападу і весела правесці канікулы.

Падчас тыдня дзіцячай кнігі ў бібліятэцы № 7 для удзельнікаў клуба “Чытайка” і выхаванцаў дзіцячага сацыяльнага прытулку г. Гродна быў праведзены ”Экалагічны чацвер”. Бібліятэкары арганізавалі сустрэчу з супрацоўнікам Гродзенскага заалагічнага парка Таццянай Мікалаеўнай Саўчук і яе падапечнымі – марской свінкай Дуней, хамячком Боркам і пацучкамі Гаечкай і Аськай. Дзеці даведаліся як даглядаць за гадаванцамі, пагладзілі іх і патрымалі ў руках, і нават, паспрабавалі карміць кавалачкамі яблыка. Актыўна ўдзельнічалі ў віктарыне пра жывёльны свет (Гл. дадатак № 2) і рухомай гульні. Пераможца атрымаў у падарунак экалагічны плакат.



**Сустрэча з супрацоўнікам Гродзенскага заалагічнага парка Т.М. Саўчук**

Да кожнага мерапрыемства ў клубе “Чытайка” рыхтаваліся яркія, маляўнічыя выставы, якія змяшчалі казкі, легенды і паданні, прыгодніцкую літаратуру, выданні пра жывёльны і раслінны свет. Сярод іх:

- “Кніжнае дзяцінства”;
- “Добры свет любімых кніг”;
- “Казкі XXI стагоддзя”;
- “У кніжкі сёння юбілей”;
- “Мова любай нам зямлі”;
- “Што мне летам прачытаць?”;
- “Прапануем дзецям і бацькам”;
- “Гродна – мой горад”;
- “Мы – прыроды нашай сябры” .

***

Кіраўнік дзіцячага літаратурнага клуба “Чытайка”, Змітровіч Кацярына Дзмітрыеўна, і найдалей плануе пошук новых форм клубнай работы, распрацоўку займальных праграм пасяджэнняў і мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю кнігі і прыцягненне школьнікаў да чытання, спадзяецца, што яе задумкі будуць цікавымі і карыснымі для юных чытачоў.

**Дадатак № 1**

# ”60 гадоў з “Вясёлкай”:

## сцэнарый літаратурнай гадзіны

**Мэта мерапрыемства:** пазнаёміць дзяцей з гісторыяй стварэння, структурай, аўтарамі беларускамоўнага дзіцячага часопіса “Вясёлка”.

**Абсталяванне:** кніжная выстава “60 гадоў з “Вясёлкай” (уключае рубрыкі, прысвечаныя жыццю і творчасці Васіля Віткі, Янкі Купалы і Якуба Коласа, Уладзіміра Ліпскага, сучасных беларускіх аўтараў, чые творы былі надрукаваныя ў выданні), нумары часопіса “Вясёлка” для кожнага ўдзельніка мерапрыемства.

**Ход мерапрыемства:**

**Вядучая:** Добры дзень, хлопчыкі і дзяўчынкі! Усе мы любім чытаць часопісы. Скажыце, калі ласка, чым яны прываблiваюць вас?

(**Прыкладныя адказы ўдзельнікаў:** *часопісы яркія, з малюнкамі; у іх ёсць казкі і вершы, загадкі і рэбусы, цікавыя апавяданні; яны не такія тоўстыя, як кнігі і інш.*)

**Вядучая:** Сёння мы з вамі святкуем дзень нараджэння аднаго з самых любімых беларускімі дзецьмі часопісаў – “Вясёлкі” – прайшло 60 гадоў з часу выхаду ў свет першага нумара гэтага выдання. Уявіце сабе маленькімі сваіх бабулю і дзядулю, калі ім было столькі гадоў, як вам зараз. Яны з радасцю чыталі першы нумар “Вясёлкі”, які пабачыў свет у красавіку 1957 года. А пачынаўся ён вершам пра вясёлку знакамітай беларускай паэткі Эдзі Агняцвет:

Яна не толькі добры госць,
Яна – Ваш друг найпершы.
“Вясёлка” ёсць – і казкі ёсць,

Загадкі, песні, вершы.
Калі вы будзеце расці
Руплівыя, як пчолкі, –
Свяціць Вам будуць у жыцці
Усе колеры вясёлкі!

**Вядучая:** Заснавальнікам дзіцячага часопіса “Вясёлка”, яго першым галоўным рэдактарам быў вядомы беларускі пісьменнік, казачнік, настаўнік і захавальнік роднай мовы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Васіль Вітка.

Васіль Вітка сабраў калектыў аднадумцаў – пісьменнікаў і паэтаў, якія пісалі для дзяцей. На старонках “Вясёлкі” друкаваліся вершы і апавяданні Янкі Купалы і Якуба Коласа, многія з іх былі ўключаны ў падручнікі для пачатковай школы. Творы, якія змяшчаліся ў “Вясёлцы” выйшлі ў свет і як асобныя кнігі – “Нам засталася спадчына” Янкі Купалы, “Сядзіба, або Хата з матчынай душой” Міколы Маляўкі і іншыя.

Часопіс “Вясёлка”, на той час, быў адзіным выданнем на Беларусі для дзяцей, а пісьменнікі і паэты з задавальненнем пісалі для іх. У сваёй творчасці яны імкнуліся навучыць хлопчыкаў і дзяўчынак любіць Радзіму, прывіць любоў да роднай мовы, культуры, гісторыі. Так пісаў Васіль Вітка ў вершы “Беларусь”:

**(Верш чытае адзін з удзельнікаў мерапрыемства)**

На карце вялікага свету
Яна – як зялёны лісток,
Сасмаглая песня лета,
Жывое вады глыток,

Адвечная калыханка,
Душы запаветны куток.
Трапеча гарачым ранкам
На дрэве нястомны лісток,

А ў навальніцу б'ецца,
Нябачны паміж лісця,
Як роднае матчына сэрца,
Што мне даражэй жыцця.

**Вядучая:** Пра творы, якія доўга жывуць, кажуць: “Праверанылся часам”. Творы, напісаныя славутым Васілём Віткам, належаць менавіта да такіх. Бо на іх гадаваліся нашы бацькі, дзядулі і бабулі і яны да гэтай пары цікавыя дзецям.

У сучасны час галоўным рэдактарам часопіса “Вясёлка” з’яўляецца выдатны беларускі пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, Уладзімір Ліпскі. Усё сваё свядомае жыццё ён прысвяціў дзецям: амаль 40 гадоў ўзначальвае часопіс “Вясёлка”, а таксама стварыў для дашкольнікаў часопіс, чытанку-маляванку “Буся”. Гэтыя выданні 15-тысячным тыражом прыходзяць у кожны раён Беларусі, іх выпісваюць сем’ямі, чытаюць у бібліятэках.

Уладзімір Ліпскі вядомы не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Яго мастацка-дакументальныя аповесці, эсэ, нарысы і апавяданні, кнігі для дзяцей перакладзены на рускую, украінскую, літоўскую, нямецкую мовы.

Шмат твораў напісаў Уладзімір Ліпскі для дзяцей “вясёлкаўскага” ўзросту. У жанрах казак, аповесцяў, апавяданняў выйшлі яго папулярныя кнігі “Каралева белых прынцэс”, “Прыгоды Нуліка”, “Наша Маша”, “Вясёлая азбука”, “Антонік-Понік” і іншыя.

Уладзімір Ліпскі імкнецца сваёй творчасцю сцвярджаць дабро, вучыць любіць сваю Радзіму і кожнага чалавека ў ёй, адчуваць радасць ад жыцця і літаратуры. Відаць, таму ён працягнуў справу Васіля Віткі.

Пра Уладзіміра Ліпскага, яго стаўленне да дзяцей і дзіцячай літаратуры вельмі вобразна напісаў народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін:

**(Верш чытае адзін з удзельнікаў мерапрыемства)**

Скачыце, зайчыкі і ліскі,
З настроем будзьце, таты, мамы.
Няхай жыве Уладзімір Ліпскі –
Сярод дзяцей дарослы самы!

**Вядучая:** Давайце пазнаёмімся з рубрыкамі нашага любімага часопіса. У сучасны час акрамя твораў беларускіх класікаў у “Вясёлцы” друкуюцца вершы, апавяданні і казкі маладых літаратараў пра Радзіму, прыроду, сяброўства, дабрыню і інш. Яны змяшчаюцца ў рубрыцы “Упершаню ў “Вясёлцы”.

Беларускія дзяўчынкі і хлопчыкі таксама маюць магчымасць размясціць свае асабістыя творы ў рубрыцы “Чароўны куфэрак”.

Рубрыка “Крышку пра кніжку” знаёміць юных чытачоў з новымі дзіцячымі кнігамі, якія выйшлі ў выдавецтвах Беларусі.

Займальную інфармацыю, цікавыя факты на самыя розныя тэмы можна знайсці ў рубрыцы “Школка грошыка”.

Тэксты дзіцячых п’ес для пастаноўкі ў школьным тэатры змяшчаюцца ў рубрыцы “Тэатр Васі Вясёлкіна”.

У 2017 годзе складальнікі часопіса прапануюць дзецям “падвучыцца” роднай мове: з дапамогай займальных урокаў праверыць свае веды і пазбавіцца памылак. А цікавыя заданні, загадкі і задачкі дапамогуць у гэтым.

Таксама ў бягучым годзе на старонках “Вясёлкі” сучасныя чытачы могуць пазнаёміцца з “вясёлкавымі” творамі мінулых гадоў.

“Вясёлка” – гэта не толькі казкі, апавяданні, загадкі, вершы. Гэта яшчэ і выдатныя ілюстрацыі, аўтары якіх – лепшыя беларускія мастакі – Сяргей Волкаў, Кацярына Білан і іншыя.

Таленавіты калектыў часопіса “Вясёлка” жадае бачыць нашу Беларусь багатай і квітнеючай, а сваіх чытачоў – здаровымі і шчаслівымі.

**Вядучая:** А цяпер я запрашаю вас у вясёлае падарожжа па адной з рубрык “Вясёлкі” – “Хвілінкі–весялінкі”. Адкрываем апошнюю старонку часопіса і знаходзім самае вясёлае і цікавае.

Вось, напрыклад, загадкі гродзенскага паэта Віктара Сямёнавіча Кудлачова:

Па вуліцы я катаюся,
За два правады трымаюся.
На калесах маіх –цэлы дом,
Ты ездзіш у ім часцяком.
З сябрамі – у школу, са школы
Хто ж я, дом на колах?

(Тралейбус)

Ён друкуе, лічыць слаўна
І гуляе ў гульні ўпраўна.
Сябраваць з ім кожны рад.
Гэта што за апарат?

(Камп’ютар)

**Вядучая:** Адгадайце, калі ласка, яшчэ загадкі з “Вясёлкі” :

Хоць не птушка –
Лётаць можа.
Памагае
хвост прыгожы.

(Вавёрка)

Ля вады яго хаціна,
Можа будаваць плаціны,
Дрэва рэжа ён зубамі.
Хто такі – скажыце самі.

(Бабёр)

Не кравец і не шавец,
А заўжды з іголкамі –
Вострымі і колкімі.

Мо таму такі храбрэц.

(Вожык)

Шыльду вешаюць ля брамы,
Што ў двары ён злосны самы.
Да той шыльды ён прывык,
Як-ніяк, а вартаўнік.

(Сабака)

Ляціць – вые.
Сядзіць – рые …
Не бяры яго ў капшук,
бо карысны кожны …

(Жук)

Рук не мае, ног не мае,
А паўзе, хвастом віляе.
Дакранешся – зашыпіць,
Нават можа і укусіць…

(Змяя)

Моцна хмару страсянуў –
Нават дождж з яе лінуў!
Учыніў на ёй пагром.
Вось такі ён грозны – …

(Гром)

Ці то тканыя сувоі,
Ці то казачны мроі –
Адплываюць у край далёкі
Беласнежныя …

(Аблокі)

Хто аблокі век ганяе
І вандруе па планеце?
А з лістотай хто гуляе?
Здагадаўся? Гэта …

(Вецер)

Неўтаймоўны, спрытны, дужы.
Як маланка, як агеньчык.
Скача ён па вокнах, лужах –
Жвавы сонечны…

(Праменьчык)

Круглае, малое
вакол свету ходзіць.
Аблачынкі роем
за сабою водзіць.
Паглядзі ў аконца:
хто прачнуўся? ..

(Сонца)

**Вядучая:** А цяпер паспрабуйце адгадайць загадкі-блытанкі:

Хто такая – уцякае
І сляды свае змятае?
Хвост – як рудая каса,
Гэта, пэўна … кілбаса?

(Не, ліса)

Каля дрэва – велікан,
Шыя доўгая, бы кран,
Ці як слуп для тэлеграфа.
Правільна, што гэта – шафа?

(Не, жырафа)

Тоўсты ён, фырчыць, булькоча,
Спіна над вадой бліскоча.
Разяўляе моцна рот,
А завецца ён … кампот?

(Не, бегемот)

Ногі тоўстыя – нямала!
Вуха – быццам бы махала,
Сам ён важыць пару тон.
Можа, гэта царскі трон?

(Не, слон)

На сабе нясе ён горы,
Не адчуе смагі, зморы,
Праз пяскі яго маршрут
Праўда, гэта – парашут?

(Не, вярблюд)

**Вядучая:** Вось мы і пазнаёміліся з дзіцячым беларускамоўным часопісам "Вясёлка", які існуе ўжо 60 гадоў і радуе тых, хто любіць чытаць на роднай мове. Памятайце, што гэты часопіс дарослыя пішуць для кожнага з вас. Няхай жа іх слова шчырасці і дабра жывуць ў вашых сэрцах!

# ”Птушкі, рыбы, звяры”:

## экалагічная віктарына

### Пытанні на тэму ”Птушкі”:

- Якая птушка выводзіць птушанят у лютыя маразы? (Крыжадзюб)
- Якую птушку называюць перасмешнікам за тое, што яна ўмее передражніваць галасы іншых птушак? (Шпак)
- Чаму цецерукі і курапаткі вельмі незадаволеныя, калі снег ноччу пакрываецца шарпаком? (Яны начуюць у снезе)
- Дзе робяць гнёзды ластаўкі-берагавушкі? (Па абрывах рэк)
- Як называецца самая маленькая птушка беларускага лесу? (Каралёк)
- Якое птушаня, калі сядзіць, падобнае на абломак галінкі? (Казадой)
- Якая птушка нашых лясоў не выседжвае яйкі? (Зязюля)
- Ці спяваюць пералётныя птушкі на чужыне? (Не спяваюць, не ўюць гнёзды, не выводзяць птушанят)
- Якую птушку называюць лясным доктарам? (Дзятла)
- Як называецца нос птушкі? (Дзюба)
- Сімвалам чаго прызнаны голуб? (Міру)

### Пытанні на тэму ”Рыбы”:

- Якая беларуская рыба плыве на нераст у Саргасава мора? Дзе яна жыве на тэрыторыі Беларусі? (Вугор, Нарач)
- Якая рыба без лускі? (Сом)
- Якая рыба нагадвае змяю? (Вугор)
- Якія рыбы зімуюць чародамі? (Ляшчы)
- Якія рыбы маюць вусікі? (Сом, сазан, вусач, карп)

- Якую рыбу называюць падводным санітарам? (Шчупака)
- Якія рыбы маюць зброю на носе? (Рыба-меч, рыба-піла)
- Якіх вы ведаеце "электрычных" рыб? (Электрычны сом, электрычны вугор)
- Якая акварыўмная рыбка называецца так, як астранамічная прылада? (Тэлескоп)
- Якая з рыб валодае неверагодным інтэлектам? (Дэльфін)
- Якая рыба носіць імя чалавека? (Карп)
- Якія рыбы доўга жывуць? (Шчупак –100 гадоў, сом – да 60 гадоў)

**Пытанні на тэму "Звяры":**

- Якой істоце беларускага лесу лягчэй бегчы ўгару, чым з гары? Чаму так атрымліваецца? (Заяц: у яго заднія ногі даўжэйшыя за пярэднія)
- Якія жывёлы спяць з адкрытымі вачыма? (Зайцы)
- Ці ўсе зайцы зімой белыя? (Не. У зайца-русака застаецца шэрай верхняя частка спіны)
- Які звер лёгка бегае па багністых балотах? (Лось)
- Што губляе лось кожную зіму? (Рогі)
- Які звер лічыцца санітарам лесу? (Воўк)
- Што есць зімой барсук? (Нічога, зімой ён спіць)
- Дзе праводзяць зіму мядзведзі? (У бярлозе)
- У якога ляснога звера зімой з'яўляюцца дзіцяняты? (У мядзведзя)
- Якога звера называюць шатуном? (Мядзведзя, які зімой прачнуўся, называюць "мядзведзь-шатун")
- Каму хвост служыць рулём, а часам парашутам? (Вавёрцы)
- Які лясны жыхар сушыць сабе грыбы на дрэвах? (Вавёрка)
- Што будуюць бабры з дрэў? (Плаціны)
- Якую жывёлу называюць "лясная кошка"? (Рысь)

- Каго называюць “царом Белавежскай пушчы”? (Зубра)
- Каго называюць “царом звяроў”? (Ільва)
- Каго называюць “каралём пустыні”? (Вярблюда)
- З чаго складаецца горб у вярблюда? (З тлушчу)
- Якія ногі ў жырафы даўжэй, пярэднія або заднія? (Аднолькавыя)
- Каго называюць гаспадаром палярнага краю? (Белага мядзведзя)
- Ці ўмеюць плаваць сланы? (Так. Яны добра апускаюцца ў ваду, выставіўшы хобат над паверхняй)
- Шкура якой драпежнай жывёлы пакрыта палоскамі? (Шкура тыгра)
- Як называюць месцы, у якіх ахоўваюць рэдкія віды жывёл і раслін? (Запаведнікі, заказнікі).

**Бліц ”Самыя, самыя, самыя”:**

- Самы буйны з зайцаў у нашых лясах. (Русак)
- Самы палахлівы звярок. (Заяц)
- Самы маленькі звярок. (Землярыйка)
- Самы акуратны звярок. (Барсук)
- Самы нязграбны і касалапы. (Мядзведзь)
- Самая калючая жывёла. (Вожык)
- Самы вядомы будаўнік плацін. (Бабёр)
- Самая буйная жывёла, якая жыве ў беларускіх лясах? (Зубр)
- Самая вялікая рыба беларускіх вадаёмаў. (Сом)
- Самая драпежная рыба беларускіх рэк і азёраў. (Шчупак)
- Самыя буйныя яшчаркі. (Вараны)
- Самыя буйныя паўзуны. (Кракадзілы)
- Самая буйная змяя. (Анаконда)
- Самая высокая жывёла на Зямлі (Жырафа)

- Самая даўганогая жывёла. (Жырафа)
- Самая буйная жывёла на сушы. (Слон)
- Самы буйны марскі рак. (Амар)
- Самая буйная драпежная птушка? (Грыф)
- Самая буйная марская птушка. (Альбатрос)
- Самая маленькая птушка на зямлі. (Калібры).

# Кніжкіна часіна

**З вопыту работы дзіцячага літаратурнага клуба “Чытайка” бібліятэкі-філіяла № 7**


| | |
|---|---|
| Складальнік | А.С. Рубель |
| Рэдактар | Н.Ю. Наземцава |
| Адказны за выпуск | М.А. Камарова |

# Змест

Кніжкіна часіна ____ 1

Дадатак № 1 “60 гадоў з “Вясёлкай”:
сцэнарый літаратурнай гадзіны ____ 17

Дадатак № 2 “Птушкі, рыбы, звяры”:
экалагічная віктарына ____ 25